# Кафедра беларускай і сусветнай мастацкай культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры:

## гістарычны партрэт



Выхаванне дзеяча мастацкай культуры грунтуецца на засваенні практычных і тэарэтычных ведаў. Творчыя здольнасці аўтараў мастацкіх твораў (кампазітараў, мастакоў, драматургаў, сцэнарыстаў) і іх выканаўцаў (музыкантаў-інструменталістаў, акцёраў), а таксама рэжысёраў-пастаноўшчыкаў музычных і драматычных спектакляў, тэатральных відовішчаў, кінафільмаў заўсёды фарміраваліся на падставе прынцыпаў тэарэтычнага асэнсавання сацыякультурных з'яў. Разам з тым тэорыя і гісторыя мастацтва з'яўляецца неабходным, абавязковым прадметам вывучэння для культуролагаў, што працуюць у розных сферах прафесійнага і аматарскага мастацтва.

Менавіта таму з першых дзён існавання Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры (першапачатковая назва — Мінскі інстытут культуры) у ім была створана кафедра тэорыі і гісторыі культуры, цяпер яе назва — кафедра беларускай і сусветнай мастацкай культуры.

У той час на кафедры працавалі спецыялісты розных профіляў — выкладчыкі гісторыі тэатра, выяўленчага мастацтва, гісторыі і тэорыі музыкі і інш. Першым загадчыкам кафедры тэорыі і гісторыі культуры быў кандыдат філалагічных навук Алег Канстанцінавіч Саннікаў (1928—1983). Ён вызначаўся добразычлівасцю, уважліва ставіўся да людзей, да калектыву. Сын вядомага беларускага рэжысёра, акцёра і педагога, народнага артыста БССР, прафесара Канстанціна Мікалаевіча Саннікава, А.К.Саннікаў прыўнёс у дзейнасць кафедры атмасферу інтэлігентных і высокапрафесійных зносін са сваімі маладымі калегамі. Падчас працы ў ВНУ ён быў ужо вядомым даследчыкам беларускай драматургіі і беларускага народнага тэатра.

З 1983 г. кафедрай пачаў загадваць Гурый Іларыёнавіч Барышаў (1928—2001). Сярод навукоўцаў і педа-

**ПРАКАПЦОВА Вера Паўлаўна** – загадчык кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры, доктар мастацтвазнаўства, прафесар



**ГРАЧОВА Вольга Алегаўна** – дацэнт кафедры псіхалогіі і педагогікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры



РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

гогаў Беларусі ён выдзяляўся энцыклапедычнымі ведамі ў галіне гісторыі і тэорыі выяўленчага і тэатральнага мастацтва, вялікай працаздольнасцю, навуковай актыўнасцю. У 1990 г. Г.І.Барышаў абараніў дысертацыю на саісканне вучонай ступені доктара мастацтвазнаўства, атрымаў званне прафесара, у 1999 г. — званне правадзейнага члена Беларускай акадэміі адукацыі. Яго намаганнямі кафедра змяніла свой статус – стала выпускаючай: у 1992 г. быў распрацаваны новы вучэбны план і адкрыта адпаведная спецыялізацыя «беларуская і сусветная мастацкая культура». З агульнанавуковай кафедра ператварылася ў спецыяльную і з гэтага часу пачала называцца кафедра «беларускай і сусветнай культуры». З 1994 г. ёй загадвае доктар мастацтвазнаўства, прафесар Вера Паўлаўна Пракапцова.



У 1996 г. пры кафедры была адкрыта магістратура па спецыяльнасці «мастацтва» і аспірантура па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя мастацтва». Навуковая праблематыка магістэрскіх і аспіранцкіх даследаванняў прадстаўлена вельмі шырока і ахоплівае пытанні гісторыі і тэорыі развіцця мастацкай культуры ў Беларусі, асобных відаў мастацтва, кампаратыўнага аналізу іх узаемадзеяння, пытанні фарміравання жанраў, семіётыкі і семантыкі твораў мастацтва і г.д.

**А.К.Саннікаў, Г.І.Барышаў, В.П.Пракапцова падабралі высокапрафесійны педагагічны калектыў, стварылі на кафедры атмасферу высокай духоўнасці, інтэлігентнасці. Амаль што ўсе выкладчыкі, якія сёння працуюць на кафедры, маюць навуковыя ступені і вучоныя званні.**

Вельмі добра працуе кандыдат мастацтвазнаўства Наталля Анатольеўна Агафонава. Яна вядома не толькі як кінакрытык і навуковец, але і як таленавіты выкладчык. Яе падручнікам карыстаюцца і ў школах, і ў ВНУ.

На кафедры выкарыстоўваюцца не толькі традыцыйныя, але і інавацыйныя тэхналогіі выкладання: камп'ютэрныя праграмы-тэсты (аўтар — дацэнт В.А.Грачова), вучэбны дапаможнік на CD-носьбіце (аўтар — прафесар В.П.Пракапцова), відэакомплекс па кінамастацтву (аўтар — дацэнт Н.А.Агафонава), аўдыёкомплекс па музычнаму мастацтву (аўтары — выкладчык Л.В.Ізмаілава і дацэнт В.Р.Гудзей-Каштальян). Да інавацый можна аднесці і практыкумы-экскурсіі па культурна-гістарычных мясцінах Беларусі (гэтым займаюцца кандыдаты педагагічных навук, дацэнты С.У.Хрол і А.М.Пацыенка, старшыя выкладчыкі І.М.Гатоўчыц і Я.Я.Барысава). Мір, Навагрудак, Нясвіж, Крэва, Гальшаны, Магілёў і іншыя мясціны штогод наведваюць студэнты і выкладчыкі кафедры.

**Дзякуючы намаганням В.П.Пракапцовай у 2002 г. кафедра беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўпершыню распачала набор на новую спецыяльнасць — кампаратыўнае (параўнальнае) мастацтвазнаўства. Гэта другая спецыялізацыя, па якой рыхтуюцца студэнты. Першая — выкладчык сусветнай мастацкай культуры — ужо сёння адзначыла юбілей — 10 гадоў існавання. Для арганізацыі вучэбнага працэсу па новай спецыяльнасці распрацаваны вучэбны план, які не мае аналагаў у іншых навучальных установах. У ім прадугледжваецца вывучэнне гісторыі і тэорыі ўсіх відаў мастацтва — музычнага, тэатральнага, выяўленчага, кіна- і тэлемастацтва, а таксама ёсць тут і рэцэнзенцкі практыкум, дызайн.**

Спецыяліст, які рыхтуецца па азначанай спецыяльнасці, прызначаны для працы ва ўстановах культуры (філармоніях, тэатрах, кінатэатрах, музеях, навукова-даследчых установах, цэнтрах культуры і інш.), а таксама ў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах, дзе выкладаецца інтэграваны курс гісторыі мастацтваў (музычнага, тэатральнага, выяўленчага, кіно).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ён будзе валодаць сучаснымі методыкамі аналітычнай дзейнасці ў галіне кампаратыўнага мастацтвазнаўства, навыкамі комплекснага даследавання з'яў у сферы мастацкай культуры.

З кафедрай супрацоўнічаюць дактары мастацтвазнаўства А.В.Сабалеўскі, В.Ф.Нячай, Т.Д.Арлова, кандыдаты мастацтвазнаўства А.А.Лабовіч, Н.Ц.Фральцова, Г.В.Ратнікаў, Н.А.Юўчанка, В.С.Каваленка, А.М.Пікулік, В.А.Мядзведзева, А.М.Карпілава, Л.І.Маленка, Л.В.Дамненкова, Б.А.Лазука. Усе яны вядомыя даследчыкі ў галіне мастацтва.

За час існавання кафедры выкладчыкамі было распрацавана шмат традыцыйных вучэбных курсаў па гісторыі мастацтваў. Але разам з імі распрацоўваліся такія спецыфічныя курсы, як тэхніка сцэны і мастацкае афармленне спектакля, сцэнічнае афармленне танца і народны касцюм, тэорыя драмы, уводзіны ў мастацтвазнаўства, мастацтвазнаўчы семінар, аналіз помнікаў мастацтва, мастацка-матэрыяльная культура, міфы ў мастацтве, мастацкая адукацыя ў Беларусі, музычны тэатр, тэлебачанне ў сістэме экранных мастацтваў, постмадэрнізм у кіно і інш.

Выкладчыцкі склад кафедры мае вельмі высокі навуковы патэнцыял: за апошнія 10 гадоў былі апублікаваны 4 манаграфіі, 7 вучэбнах дапаможнікаў, каля 20 вучэбных праграм, больш за 50 артыкулаў у энцыклапедыях, каля 200 навуковых і публіцыстычных артыкулаў. Выкладчыкі кафедры пастаянна прымаюць удзел у рабоце рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцый.

У сакавіку 2002 года адбылася арганізаваная кафедрай першая навуковая канферэнцыя, якая была прысвечана 10-годдзю адкрыцця спецыялізацыі «беларуская і сусветная мастацкая культура». У гэтай канферэнцыі, якая пачала адлік сістэматычных сустрэч тэарэтыкаў і практыкаў у галіне беларускай і сусветнай мастацкай культуры, прымалі ўдзел выкладчыкі, аспіранты, выпускнікі кафедры і госці з іншых навукова-адукацыйных устаноў. Многія з удзельнікаў канферэнцыі звярнулі ўвагу на тое, што вялікі навуковы мастацтвазнаўчы матэрыял, які назапашаны дыпломнікамі кафедры, застаецца пакуль што не запатрабаваным з боку практыкаў мастацкай адукацыі.

За 10 гадоў кафедрай падрыхтаваны дзесяткі спецыялістаў, якія цяпер выкладаюць розныя віды мастацтваў, сусветную мастацкую культуру і шэраг культуралагічных дысцыплін у школах, культурна-адукацыйных установах, каледжах і ВНУ Беларусі. Многія маюць ступені бакалаўра і магістра.

На завяршаючым этапе прафесійнай падрыхтоўкі студэнты праводзяць даследаванне, якое абараняюць як дыпломную работу. Адметнай рысай дыпломных работ, што рыхтуюцца на кафедры айчыннай і сусветнай мастацкай культуры, з'яўляецца іх кампаратыўнасць. Выяўленне асаблівасцей і творчых дасягненняў розных эпох, культур, цывілізацый, аналіз развіцця ў гісторыка-культурным кантэксце так званых вечных тэм і вобразаў даюць магчымасць рабіць новыя, нетрывіяльныя высновы, адстойваць сучасныя погляды на мастацкі працэс.

На жаль, вялікая колькасць выдатных дыпломных работ застаецца ў фондах універсітэта. Таму ў журнале “Музычнае і тэатральнае мастацтва: праблемы выкладання» мы пачынаем серыю публікацый найбольш цікавых і грунтоўных дыпломных даследаванняў выпускнікоў кафедры айчыннай і сусветнай мастацкай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ